Шок

# Літва «зляцела з катушак»

## Суседняя краіна пачала прымусовую дэпартацыю бежанцаў

**Учора ў сеціве з'явіліся шакавальныя кадры: мігранты распавялі пра абставіны дэпартацыі з суседняй дзяржавы.**

Бежанцаў з Ірака і Камеруна жорстка збілі дубінкамі і прыкладамі літоўскія пагранічнікі (ім «дапамагалі» кінолагі ваеннай паліцыі з сабакамі), якія выкарыстоўвалі і электрашокеры. У небарак адабралі грошы і мабільныя тэлефоны. Жанчын абступілі і пачалі збіваць нагамі. Прымусовую дэпартацыю пацвердзіў намеснік міністра ўнутраных спраў Літвы Арнольдас Абрамавічус. Ён заявіў, што «ўжыванне сілы супраць мігрантаў на граніцы будзе залежаць ад іх паводзін. Пагранічнікі могуць выкарыстоўваць усе неабходныя меры, каб спыніць нелегальную міграцыю». Раней стала вядома, што кіраўнік МУС Літвы Агнэ Білатайтэ падпісала загад, які дазваляе супрацоўнікам службы аховы граніцы прымяняць не толькі псіхалагічны, а і фізічны гвалт супраць мігрантаў.

Органы пагранічнай службы зафіксавалі перасячэнне граніцы мігрантамі з тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі. Пра гэта БелТА паведаміў **афіцыйны прадстаўнік Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Антон БЫЧКОЎСКІ**. «За апошнія суткі каля сарака замежнікаў было гвалтоўна выштурхана прадстаўнікамі сумежнага боку ў Беларусь. Указаныя грамадзяне маюць прыкметы цялесных пашкоджанняў рознай ступені цяжкасці, а таксама знаходзяцца ў прыгнечаным маральна-псіхалагічным стане. Сярод іх ёсць жанчыны і дзеці, у дачыненні да якіх таксама ўжывалася фізічная сіла», — распавёў Антон Бычкоўскі.

Паводле яго слоў, пацярпелым аказваецца ўся неабходная дапамога з прыцягненнем спецыялістаў, праводзяцца мерапрыемствы па высвятленні ўсіх абставін. «Мы лічым недапушчальным выкарыстоўваць такія метады і спосабы ў дачыненні да ўразлівых асоб, а тым больш жанчын і дзяцей. Такія дзеянні груба парушаюць правы чалавека і падлягаюць расследаванню кампетэнтнымі органамі, у тым ліку міжнароднымі», — дадалі ў Дзяржпагранкамітэце.

Варта згадаць, што, згодна з артыкулам 7 Рымскага статута Міжнароднага крымінальнага суда ад 17 ліпеня 1998 года, «дэпартацыя або гвалтоўнае перамяшчэнне насельніцтва» адносяцца да ліку злачынстваў супраць чалавецтва і цягнуць міжнародную крымінальную адказнасць.

**Пётр ДУНЬКО.**

❍ **У тэму**

### ПАЛІЦЭЙСКІ ГВАЛТ, КАЛЮЧЫ ДРОТ І ВАРОЖАСЦЬ

Беларусь і многія дзяржавы Еўропы адчуваюць рост міграцыйных патокаў, але стогне і патрабуе салідарнасці толькі Літва. Пра гэта гаворыцца ў адказе **прэс-сакратара МЗС Беларусі Анатоля ГЛАЗА** журналістам, які размешчаны на сайце ведамства.

«Мігранты бягуць з разбураных вайной раёнаў у надзеі знайсці свой новы, цёплы, утульны, а галоўнае — бяспечны дом, а натыкаюцца на паліцэйскі гвалт, спіраль Бруна (віткі калючага дроту. — **Рэд.**) і адкрытую варожасць. Рост міграцыйных патокаў Беларусь адчувае і на сабе: нашы пагранічнікі ў апошні час затрымалі значна больш нелегалаў, чым раней. Многія дзяржавы Еўропы, у тым ліку якія не маюць знешніх граніц, таксама фіксуюць у сябе рост колькасці нелегалаў. Але стогне і патрабуе салідарнасці толькі Літва», — звярнуў увагу Анатоль Глаз.

У беларускім МЗС выказалі здагадку: можа быць, уладам Літвы выгадна такое становішча спраў? «І ў гэтым кантэксце нам цалкам зразумелая справядлівыя пытанні, якія літоўская грамадскасць цалкам абгрунтавана ставіць свайму ўраду. Затое высокі прадстаўнік ЕС за пафаснымі фразамі аб правах чалавека і салідарнасці актыўна ўтойвае відавочныя факты «дэмакратычных» разгонаў мірных акцый пратэсту з празмерным выкарыстаннем сілы, а таксама выпраўдзджэння мігрантаў з Літвы, уключаючы цяжарных жанчын і дзяцей, з ужываннем зброі», — адзначыў прэс-сакратар міністэрства.

Мабыць, гэта той самы выпадак, калі нехта спрабуе перакласці свае праблемы з хворай галавы на здаровую, і Еўрасаюз няўдала спрабуе выкарыстаць сітуацыю на беларуска-літоўскай мяжы для дэманстрацыі адзінства і салідарнасці, падкрэсліў Анатоль Глаз. «За гады нашай незалежнасці мы неаднойчы на справе пацвярджалі, што беларускія пагранічныя службы заўсёды адказна падыходзяць да сваіх міжнародных абавязацельстваў і да аховы рубяжоў сваёй краіны. Беларусь заўсёды была і застаецца адкрытай да канструктыўнага супрацоўніцтва і дыялогу для вырашэння любых наяўных складаных пытанняў», — падсумавалі ў знешнепалітычным ведамстве.

Прыёмная кампанія — 2021

# Патрабуюцца фізікі і матэматыкі

## У БДУ аб'яўлены дадатковы набор на бюджэтную форму атрымання адукацыі

**На дзённай форме навучання засталіся вакантныя 36 месцаў.**

На механіка-матэматычным факультэце — 14 месцаў: 8 — на спецыяльнасці «Матэматыка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць)» і 6 — на спецыяльнасці «Матэматыка (напрамак — навукова-канструктарская дзейнасць)».

На фізічным факультэце абітурыентаў чакаюць 11 месцаў: 5 — на спецыяльнасці «Фізіка (напрамак — вытворчая дзейнасць)» і 6 — на спецыяльнасці «Фізіка нанаматэрыялаў і нанатэхналогій».

У Міжнародным дзяржаўным экалагічным інстытуце БДУ імя А. Д. Сахарава пасля залічэння засталіся незапоўненыя 11 месцаў: 4 — на спецыяльнасці «Прыродаахоўная дзейнасць», 4 — на спецыяльнасці «Энергаэфектыўныя тэхналогіі і энергетычны менеджмент» і 3 — на спецыяльнасці «Ядзерная і радыяцыйная бяспека».

На завочнай форме навучання засталіся свабодныя 15 бюджэтных месцаў на механіка-матэматычным факультэце: 5 — на спецыяльнасці «Матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі (па напрамках)» і 10 — на спецыяльнасці «Матэматыка (напрамак — навукова-педагагічная дзейнасць)».

Дакументы будуць прымацца да 18 гадзін 7 жніўня па адрасе: Мінск, вуліца Ленінградская, 8 (корпус юрыдычнага факультэта).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Алімпійскі дзённік

# ТРЭНІРОЎКА АПТЫМІЗМУ

**Алімпійскія гульні ў Токіа праходзяць з уласцівай ім драматычнасцю. І пакуль беларусы працягваюць змагацца за медалі, алімпійскі чэмпіён Іван Літвіновіч вярнуўся ў Мінск, дзе яго ў святочнай атмасферы сустрэлі кіраўніцтва, сябры і паклоннікі. «Адчуванне, што алімпійскі чэмпіён, пакуль няма, можа, яшчэ з'явіцца. Планы — дадому дабрацца, адпачыць пару дзён, потым паглядзім», — сказаў Іван Літвіновіч журналістам.**

**ВЕСЛАВАННЕ НА БАЙДАРКАХ І КАНОЭ.** Затаіўшы дыханне, усе чакалі медаля ад Марыны Літвіновіч і Вольгі Худэнкі, якія выступалі ў фінальных заездах байдарак-двоек на 500 м. Спартсменкі выступілі з вынікам 1 хвіліна 37,647 секунды. Гэтага хапіла толькі для шостага месца ў выніковым пратаколе.

Яшчэ адзін лідар каманды Алег Юрэня ў фінале «В» спаборніцтваў байдарак-адзіночак паказаў 4-ы вынік і заняў на Алімпіядзе 12-е месца.

«Беларускія весляры выступілі ў двух фіналах, засталіся без узнагарод, але пасыпаць галаву попелам не варта. Вынікі цесныя, многія каманды-фаварыты пакуль без узнагарод. Хоць новазеландкі, прызнаю, — прыгажуні! Кубінцы як прыгожа ў каноэ выйгралі! Турнір у Токіа толькі стартаваў, чакаем жаночую байдарку ў адзіночцы на 500 м, на 1000 м байдарку-двойку ў мужчын. Алена Наздрова пачне 4 жніўня кваліфікацыю ў каноэ на 200 м. Гульні працягваюцца, і далей тут, на веслярным канале, будзе яшчэ цікавей», — адзначыў **галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Уладзімір ШАНТАРОВІЧ**.

Алена Наздрова, якая пачне алімпійскае выступленне 4 жніўня, нягледзячы на свае 22 гады, ужо паспела двойчы выйграць чэмпіянат свету — у 2019 і 2018 гадах. Разам з Надзеяй Макарчанкай яны выйгралі чэмпіянат Еўропы сярод юніёраў і дарослых.

**ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА.** Тацяна Халадовіч не прайшла ў фінал спаборніцтваў у кіданні кап'я. У стартавай спробе яна закінула снарад на 60 м 78 см і ў астатніх спробах не магла кінуць лепш. Як вынік — 13-е месца кваліфікацыі.

У сераду пачнуць выступленні ў кіданні кап'я Аляксей Каткавец і Павел Мялешка. Свой найлепшы вынік у кар'еры Аляксей Каткавец паказаў у 2020 годзе на чэмпіянаце краіны. Яго 86,05 м пераўзыходзіць «бронзавы» вынік Алімпіяды ў Рыа. Павел Мялешка ў маі гэтага года на Кубку Еўропы па кіданнях заваяваў «бронзу», закінуўшы снарад на 82,55 м. Гэты вынік зусім не мяжа спартсмена, у пачатку чэрвеня на турніры ў Чэхіі кап'ё Мялешкі паляцела на 85,06 м.

У сераду ў Токіа пачнуцца спаборніцтвы дзесяціборцаў, у якіх Беларусь прадставіць Віталь Жук, дарэчы, муж Ірыны Жук. Каб ацаніць, наколькі гэта моцны чалавек, варта мець на ўвазе, што ў праграму мужчынскага дзесяцібор'я ўваходзяць бег на 100 м, скачок у даўжыню, штурханне ядра, скачок у вышыню, бег на 400 м, 110 м з бар'ерамі, кіданне дыска, скачок з шастом, кіданне кап'я, бег на 1500 м.

**БАРАЦЬБА.** Барэц грэка-рымскага стылю Кірыл Маскевіч уступіў у 1/8 фіналу алімпійскага турніру прадстаўніку Егіпта Махамеду Метвалі. Спаборніцтвы па барацьбе працягваюцца. Да выхаду на дыван рыхтуецца Алі Шабанаў. Пачне сваё выступленне і «зорачка» беларускай жаночай барацьбы Ірына Курачкіна. Яе стрыжню, любові да сваёй справы і мэтанакіраванасці можна толькі пазайздросціць. З барацьбой яна пазнаёмілася ў 16 гадоў, што для любога віду спорту надта позна. А да гэтага займалася лёгкай атлетыкай — бегала на кароткія дыстанцыі. За 10 гадоў у барацьбе яна мужна пераносіла траўмы, перапынкі, страхі і збірала медалі розных турніраў. У яе скарбонцы поўны камплект медалёў чэмпіянатаў Еўропы і дзве «бронзы» чэмпіянатаў свету.

І хоць да заканчэння Алімпіяды ў Токіа застаецца ўсё менш часу, надзеі страчваць не варта. Алімпійскія гульні заўжды славіліся сваёй непрадказальнасцю.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### МВФ выдзеліць 650 мільярдаў долараў на аднаўленне сусветнай эканомікі



Кіраўніцтва Міжнароднага валютнага фонду вырашыла выдзеліць спецыяльныя правы запазычання (SDR) у памеры рэкордных 650 млрд долараў на аднаўленне эканомік 190 членаў Фонду прапарцыянальна іх квотам. Асаблівая ўвага аддаецца краінам з нізкім і сярэднім узроўнем даходаў. Ім дастанецца амаль палова маючых быць выдзеленымі сродкаў — 275 млрд долараў. Яны вылучаюцца краінам, якія развіваюцца, без традыцыйных для МВФ умоў. Гэта незваротныя грошы, вяртаць іх не трэба. «Прынята гістарычнае рашэнне, — адзначаецца ў заяве дырэктара МВФ Крысталіны Георгіевай. — Гэта найбуйнейшае вылучэнне SDR у гісторыі Фонду. Яно як укол глабальнай эканоміцы падчас беспрэцэдэнтнага крызісу». У МВФ лічаць сур'ёзнай перашкодай на шляху да аднаўлення пасля пандэміі абмежаваны доступ да вакцын у многіх краінах, якія развіваюцца.

### ЗША праводзяць найбуйнейшыя ваенна-марскія вучэнні з часоў халоднай вайны



Вучэнні Large Scale Exercise (LSE) — 2021 з удзелам 36 караблёў (у тым ліку авіяносцы і падлодкі) і Корпуса марской пяхоты праводзяцца ў 17 часавых паясах, паведаміла ТАСС. Манеўры будуць доўжыцца два тыдні. Як заўважыла газета Stars and Stripes, гэтыя вучэнні павінны паказаць здольнасць амерыканскіх узброеных сіл адначасова спраўляцца з выклікамі ў аддаленых адна ад адной частках Сусветнага акіяна, у тым ліку ў Чорным, Міжземным, Паўднёва-Кітайскім і Усходне-Кітайскім морах. «LSE-2021 праверыць навыкі нашых камандзіраў па правядзенні разнастайных ваенна-марскіх аперацый на тактычным і стратэгічным узроўнях. Да ўдзелу прыцягнутыя Корпус марской пяхоты, што прадэманструе магчымасці нашага флоту праводзіць сумесныя аперацыі як у адкрытым акіяне, так і ў прыбярэжных водах», — заявілі ў камандаванні Шостага флоту.

### У М'янме сфарміравалі часовы ўрад



Дзяржаўны адміністрацыйны савет М'янмы заявіў пра фарміраванне часовага ўрада краіны. Пра гэта паведаміла агенцтва «Сіньхуа». Паводле яго даных, галоўнакамандуючы Узброенымі Сіламі М'янмы старшы генерал Мін Аун Хлайн займе пасаду прэм'ер-міністра краіны. Паводле звестак агенцтва, старшы генерал таксама выступіў з тэлевізійным зваротам, у якім заявіў, што ў краіне плануецца правесці новыя ўсеагульныя выбары ў другой палове 2023 года. Як вядома, ваеннае камандаванне М'янмы 1 лютага абвясціла аб увядзенні на год надзвычайнага становішча і зрушэнні грамадзянскага кіраўніцтва краіны. Прадстаўнікі войска растлумачылі гэта маштабнымі фальсіфікацыямі, якія, на думку сілавікоў, адбыліся на ўсеагульных парламенцкіх выбарах, якія прайшлі ў лістападзе 2020 года.